*УДК [61+615.1](06)(043.2)*
*ББК 5+52.81*
*А 43*
*ISBN 978-985-21-1569-8*



***Кароль А.М.***

# ГЕНАЦЫД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА З УСПАМІНАЎ МАЁЙ СЯМ'І

***Навуковы кіраўнік: канд. гіст. навук, дац. Мацюш П.А.***
*Кафедра філасофіі і паліталогіі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Генацыд беларускага народа з'яўляецца адной з самых трагічных падзей у гісторыі Беларусі, яго вывучэнне дазваляе лепш зразумець гісторыю краіны і беларускага народа. Расказ аб генацыдзе праз прызму гісторыі ўласнай сям'і робіць тэму больш жывой і рэалістычнай, што дапамагае лепш усвядоміць маштабы трагедыі і яе ўплыў на жыццё звычайных людзей. Работа дапамагае захаваць памяць аб ахвярах генацыду для будучых пакаленняў. Акрамя таго, вывучэнне гісторыі генацыду беларускага народа можа садзейнічаць разуменню і вырашэнню сучасных глабальных праблем, звязаных з генацыдамі ў розных частках свету.

**Мэта:** раскрыць тэму генацыду беларускага народа праз досвед маёй сям'і.

**Матэрыялы і метады.** У дадзенай навуковай працы выкарыстоўваліся наступныя матэрыялы і метады:

1. Аналіз гістарычных крыніц: вывучэнне гістарычных дакументаў, звязаных з генацыдам беларускага народа (архіўныя дакументы, газетныя артыкулы, дзённікі, лісты і інш.).

2. Вывучэнне сямейных гісторый (вусныя гісторыі і асабістыя запісы маёй сям'і, якія даюць інфармацыю аб дзейнасці людзей падчас перыяду Вялікай Айчыннай вайны).

3. Рэтраспектыўны метад. Гэты метад заснаваны на вывучэнні захаваных да моманту вывучэння крыніц ведаў аб мінулым і рэканструяванні карцін мінулага на аснове існуючых крыніц.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Генацыд беларускага народа з'яўляецца важным і складаным аспектам гісторыі Беларусі. Праз асабісты досвед гэта падзея была даследавана з унікальнай перспектывы.

З успамінаў маёй сям'і можно ўбачыць, як праводзіўся генацыд на тэрыторыі нашай краіны: знішчэнне насельніцтва, канцэнтрацыйныя лагеры, выкарыстоўванне дзяцей у якасці донараў крыві… Даследаванне падкрэслівае важнасць памяці аб генацыдзе і яго ўплыве на беларускі народ. Гісторыя нашага народа – прыклад стойкасці ў абліччы трагедыі. Гэта падкрэслівае важнасць перадачы гэтых гісторый будучым пакаленням, каб не забываць пра мінулае і працягваць барацьбу за справядлівасць і мір.

**Вынікі.** Генацыд беларускага народа пакінуў глыбокі след у гісторыі і культуры Беларусі. Даследаванне гэтай тэмы дазволіла ўбачыць маштабы трагедыі і яе наступствы для беларускага народа. Асабліва важным было вывучэнне гісторыі з успамінаў уласнай сям'і, якая дазволіла ўбачыць гэтыя падзеі праз асабісты досвед. Гэта даследаванне падкрэслівае важнасць захавання гістарычнай памяці і перадачы ведаў аб мінулым будучым пакаленням. Беларускі народ прадэманстраваў стойкасць, мужнасць і гераізм, што з'яўляецца важным урокам для ўсіх нас.